спадчына

Алесь Емяльянаў



...Ня я цябе адмыкаю,
ня ты адмыкаеш мяне.
Стыне пяшчота над Краем,
замкнёная ў пільнай труне…

# Кожны мае свой край

*Бывай, наш сумны птах…*
*Ты ў Бога на руках*
*Твае дачушкі, АХ*

***Пасівелі расстанна журботныя літары ў сэрцавіне крыжа. Табе споўнілася б у падступалым цяпер самотным сакавіку пяцьдзясят пяць. Але ты далёка, з Дзядамі, ад кастрычніка 2005-га. Ты выбраў так, пакутна й годна.***

***Там, за небакраем-жыцьцяграем, табе ўжо не ўразумець, навошта… Навошта зьбіраю, шукаю, складаю радкі твае, словы, здогады?.. Спамінаю навошта?***

***Каб верыла, што дашапчуся, і ты пачуеш – ня ўздых, ня ўсхліп, не самашкадаваньне, але трымценьне тае танюткае ніціны-повязі, што выструнена між душамі ў бязьмежнасьць, дык спытала б: ты прыняў сьмерць за вызваленьне, як намерваўся тут, адзінотна трываючы боль?***

***Дзеля адказу самой сабе жыцьцё наша перагортваю,***

***расчытваю непрамоўленае, думаю, дасылаю ў Вышу маленьне. З маўклівага сыходу твайго выпрадаю нітво прасьцягу: і там, за празрыстай засьвай, скуль ня сьвеціць болей усьмешка твая, ты Ёсьць. Задоўга ж да восеньскага дня, калі сумным паглядам зьліўся з Небам, прытуліўшыся схварэлымі плячыма да вушака чужых дзьвярэй, сагрэўшы на ростань каменную прыступку чужога ганку, адкрыў збалела: усе мы нязьменна Ёсьць. Апошняя давернасьць твая так шмат растаемніла, даючы спадзеву: дараваў счужэласьць маю надумную.***

***Зрэшты, там, дзе ты Ёсьць і скуль суджана, пэўна, зноў зьявіцца, усё – адчужана, што было дарагім, і ўсё – Сваё, Адзінае. Агульнае. Усё ёсьць Роднасьцю, Цэласьцю…***

***У сумневах сваіх і зблудах, у журбе згубаў і павяртаньняў ты… не баяўся сьмерці. Прынамсі, — уласнай. Гаварыў з ёю прасьветла. Узыходзячы на калінавы мост ад сябе скрушнага да сябе вальнавечнага, ці пасьпеў прыкмеціць, як Брама Духу расчынілася лёгка?.. Я пачула тут, здалёк.***

***Бо й на зямлі Прадчуваньнем ясным заходзіў жа ў тую адзіную Браму, што зводзіць імгненьне й бясконцасьць, зямное й касьмічнае ў Адно. Памятаю. Бо й каля нас, асталых у доме часовым, ты дайшоў-такі, узышоў-такі да лёсавае рысы тае, над якою вышэ й з якое праменіцца Мудрасьць.***

**Антаніна Хатэнка.**

**Звон**

Рвалі звону язык,
нібы джала зьмяі.
Звон скідалі з-пад неба ў цямніцы.
І нямелі сыны здратаванай зямлі
ля маёй безьязыкай Званіцы.

Доўга боль агняваў, чырванеў і грымеў,
дым атрутны наўкола струменіў.
І здавалася ўжо – нарадзілася сьмерць
і памерла жыцьцё ў пакаленьнях.

Ды ў бясьсільлі асьмяг уладарны касьцёр,
што Званіцу спаліў да падвалін.
Дзень гаручай сьлязой
на пажарышча сьцёк,
дзе мой Звон на агні катавалі.

Цёпла туліцца сьнег да халоднай зямлі,
выплывае з вякоў зараніца,
лес аддайна гадуе
тугія камлі –
павяртаецца ў неба Званіца
і плыве белакрыла над Памяцьцю дзён,
асьвячае сьвятыя магілы…

Не! Ня ўмёр,
не зьнямеў першароднасьці Звон,
зноў зьвініць жыцьцядайнаю сілай.

**Ты**

Вечароваю сьцежкай
ты ішла па ваду.
На чырвоным узьмежку
крыжавалі бяду.

Крыжавалі, тапталі
слугачы крумкача.
Белазубаю стальлю
месяц з неба крычаў.

Зьнічка падала скрушна
у віры забыцьця.
Вецер сіверны гушкаў
у калысцы дзіця.

Выплывала з прадоньня
памяць даўняй бяды…
Зачарпнула ў далоні
ты халоднай вады,

зачарпнула, сагрэла,
акрапіла сьлязой:
ці ўсе зоркі згарэлі
над крынічнай лазой?

Ці ўсе песьні зьнямелі
пад чарнобыльскі чад,
і ня гушкаць арэлям
закаханых дзяўчат?..

Вечаровая сьцежка –
павяртаньне ў прадзень.
Зьнічкі сумная ўсьмешка
зноў надзею прадзе…

**Не прачынайся**

Ты сьпіш. І соладка ўздыхаеш.
Зямною зоркай сьвеціцца маяк.

Над Краем ноч.
Якая ноч глухая!
Не прачынайся,
любая мая.

Адхукаю цябе дыханьнем цёплым,
аберагу спагаднаю рукой.
Не прачынайся.
Сьні вясновы поплаў
і вадаспады сонца над ракой.

Над Краем ноч. Якая ноч глухая!
А ты ж баішся чорнай нематы…
Не прачынайся толькі – заклінаю
замоўнымі маленьнямі сьвятых.

Я цемру сам адолею ў змаганьні,
я горыч-ноч агораю адзін.

Яшчэ ўскіпіць рамонкавае раньне,
яшчэ прачнецца сонечнасьць гадзін.
Ускрыліць мрою памудрэлы Краю –
ня згас,
гарыць паходняю маяк.

…Над Краем ноч. Якая ноч глухая!
Не прачынайся, любая мая!

**Тры берагі**

Ты выбірала строй
адзін… другі…
А мой настрой –
рака тугі.

Я ведаў-чуў, куды, чаму, навошта
імкне-ляціць пяшчотных вуснаў жар.
І заціхаў жаданых вёснаў пошчак,
памыла шыбы чорная імжа.

Стыў вечар чуйны ў пальчыках
дзіцячых,
стыў боль на сэрцы – даўкі ледастаў.
І я пачуў, як стойна камень плача,
убачыў я, як сьлёзы ён глытаў.

Даруй мне, ноч, за чуйнае бяссоньне –
ці ж толькі мы ня спалі да пары?..
Я ж чуў, як кветка ўсхліпнула ў далоні,
я ж бачыў, як душа яе гарыць.

О, Вышнасьць Неба,
Праведнасьць Сусьветаў!
Мы, дольныя, нясём ваш цяжкі знак.
Няўжо вы крылы дорыце паэту,
каб ён падзеньне стромае пазнаў?

Ты выбірала строй
адзін... другі...
Туга ракой –
тры берагі...

**Догма**

*Рабы – не мы, рабы – немы...*

А крыку, енку, ляманту, —
хоць вушы затыкай!
Рабы ідэй заплямленых
зямны будуюць рай.

І крэкчуць крэслы цёртыя,
зьвініць дубовы стол,
і таннымі пацёркамі
дні падаюць на дол.

Пасьмейваецца Юда –
ён самы вышні чын.
Паўсюль, ва ўсім, усюды –
хто калісь быў нічым.

Ад гаманы ў Сусьвеце –
хоць зоркам не гарэць.
Бацькоў пільнуюць дзеці
за невядомы грэх.

Расьце наклад амбону,
рыпіць пяро ідэй –
і ўжо шукаюць бомбу
пад сэрцамі ў людзей.

«Мы – не рабы!» ўзьлятае,
грыміць: «Рабы – не мы!».
І эра залатая
спакусна грэе сны.

І ў прывіднае заўтра
зноў валакуць гарбы
з асмаленым азадкам
гарластыя рабы.

**Дайце мёртваму слова...**

Дайце мёртваму слова,
а мы памаўчым.
Ён ня будзе прамоўна
маку ў ступе таўчы.

Мак яму – да лампады:
рот заціснула сьмерць.
Ён на плёткі і звады
не зважае цяпер.

І ні хлеб, ні да хлеба
не патрэбны яму.
Не баіцца за рэбры –
ён пазбаўлены мук.

Ён свабодны ад сіні,
ад паветра глытка,
ад накрэсьленых ліній,
ад званка і гудка.

Паўсядзённасьць, парадасьць —
як кругі на вадзе.
Ён даўно па-за ўладай
слоў, палітык і дзей!

Дайце мёртваму слова,
каб жывы мог даўмець,
у якіх цёплых сховах
нараджаецца сьмерць.

* * *

*«Вы шуміце, шуміце*

*нада мною, бярозы…»*

Хочаш – сьцішна чытай,
хочаш – стомна адкінь…
Упаду ля шчыта
ў галубіную стынь.

Вочы вып'е туман –
пасьвятлее ў вачах.
Не царква, не турма
мой апошні прычал.

Не пішы, не гукай,
не звані да мяне…
Кожны мае свой край.
Хто спын-край абміне?

Дзедаў весьніцца крыж –
я з Дзядамі даўно.
Памінальна акрый
ручнікамі вакно.

Бохан пахкі сьпячы,
чарку трэбна сагрэй,
у паўдзённай начы
памаліся за грэх.

Я жыву-не-жыву?..
Я іду-не-іду?..

Сонца сушыць траву,
нетра поўніць ваду.
Ладна ў сьвеце, ці – зграй,
сьветла ў сьвеце, ці не… —

кожны мае свой край.
Краю не прамінеш...

«Вы шуміце,
            шуміце…»

*   *   *

Я быў у абдоймах сьмерці,
я спаў на яе далані.
Я не жыву, паверце, —
сьмерць мае лічыць дні.

Сьмерць мае лічыць ночы
і поўня гарыць ня мне…
Жанчына, твой позірк дзявочы
ці стане жаночым, ці не?

Ня я цябе адмыкаю,
ня ты адмыкаеш мяне.
Стыне пяшчота над Краем,
замкнёная ў пільнай труне.

* * *

Прыгарні, атулі, зваражы,
пустацьвет закасі на мяжы,
дай надзею на новы ўздым –
не ўчарсьцьвелі яшчэ гады.

Не згарэлі палынна дні.
Зваражы, атулі, прыгарні,
абудзі веснавейны зьдзіў:
ветах — наш з табой маладзік.

Акрылёная, акрыляй,
зваражы, атулі, залюляй.
Хай на божай пякучай мяжы
слоў аддайных растуць спарышы.
Прыгарні…
        Уваскрэсь…
                Зваражы…

* * *

Конь начное расістае звыкла скубе –
траў някошана ў траўні зялёным.
Я апошнім уздыхам згадаю цябе,
калі дзень мой зьвякуе стамлёна.

Слухай шэпт вечаровы за нас за дваіх,
раскажы мае думкі сьвітанку.
Я застаўся. Я ўплецены ў косах тваіх
шчабятаньнем дачкі Сьвятаянкі.

Нам не ўпару было па залеве з табой,
нам не ўпару было ў зараніцы.
Двухадзінства сьцяжын завяло ў лістабой,

хоць адны нас паілі грамніцы.

Пі жыцьцё-першацьвет. Не маліся журбе.
Усьміхніся дажджам непагоды…
Я апошнім уздыхам сагрэю цябе
на ўзыходзе ў бязьмежнасьць свабоды.

**Вянок**

Калі душа — сяўнёй пустэчнай,
чарсьцьвеюць скібіны ральлі,
гадую веру ў чалавечнасьць,
у еднасьць Бога і Зямлі.

Як птушку,
гушкаю надзею.
Вянком сплятаю палыны,
што ў дзень работны і нядзельны
нам трэбна несьлі курганы.

Сплятаю чуйна
па травінцы,
па каліве, па валаску…
Вякі зьбіраю па крывінцы.
І сам я ўвесь у тым вянку.

Адкуль жыву, якога Роду, –
мне палыны вядуць апеў.
Якія годы і нягоды
я пераждыў і ацалеў?
Адкуль іду,
з чыёй паходняй,
адкуль імя маё расьце?..

Калі й было мне зрэдзь пагодна, –
ад цёплых продкавых касьцей.

Не па зямлі –
па лёсах немых
іду,
працяг сівых вякоў.
Вяду вянок – нямее немач,
нямее клацаньне клыкоў.

Да неба згорана ўздымаю
вянок, што сплецены, бадай...
Мой божы край,
мой чуйны краю,
яшчэ мне каліва падай.

* * *

Нібыта ўсё разьмерана і гладка,
нібыта ўсё, як колісь, як тады,
ды павузела між гадамі кладка –
і ўжо няма той пэўнае хады.

Багаж-багацьце летаў мулкім грузам
на плечы цісьне, гне дадолу ніц,
і вопыт дзён пражытых сьвербным гузам
смыліць над смагай выпітых крыніц.

У дол з гары сьцякае сьцежка ціха,
а жаўрукі вясну вястуюць зноў.
І ўсходзяць над зямлёю парадзіхі,
нібыта поўні несасьнёных сноў.

Шырэе кладка да кладоў дзядовых,
сьмялей жыты калосяцца ў палях.
…Нясу няскрушна тузін лап яловых
на мой апошні векавечны шлях.